# Абвесткі

**Іван Кавалёў,**
Былы сакратар камуністычнае партыі
ў Заслаўі і да апошняга часу кіраўнік
Менскага бандыцкага камітэту,
23 студзеня
ў дэпо майстроўняў дзяржаўнае чыгункі гаворыць
пра бязглуздасьць супраціву проці
немцаў (Кавалёў будзе выступаць яшчэ
й на іншых сходах жыхарства Беларусі,
аб чым будзе своечасова паведамлена).

**Папраўка.**

У новых прадуктовых картках катэгорыі «Б» (для работнікаў цяжкое працы), выдадзеных на пэрыяд ад 22/II па 21/III — 43 г., зь віны друкарні ёсьць наступныя памылкі:

1) На першым талёне зь левага боку карткі з надпісам «Хлеб I» павінна быць напісана «300 грам», а не «500 грам».

2) Першы талён з надпісам «Хлеб III — 500 грам» трэба лічыць за талён «Хлеб II — 500 грам».

3) Апошні талён на хлеб з надпісам «Хлеб IV — 200 грам» зьяўляецца лішнім, і яго зусім ня трэба лічыць.

У сувязі з гэтым даводзіцца да ведаму, што выдача хлеба на вышэйуспомненыя карткі будзе праводзіцца з выпраўленьнем гэтых памылак, гэта значыць, будзе выдавацца на кажны тыдзень па 2.300 грамаў хлеба, як і на карткі папярэдняга пэрыяду.

*Гаспадарчы аддзел Менскага Гарадзкога Камісарыяту*

**ЗГУБЛЕНЫ**
на вуліцы Мясьнікова
АДЗІН ЖАНОЧЫ ЧАРАВІК
сьветлага колеру.
Просьба вярнуць за ўзнагароду
на адрас: г. Менск, Варшаўская вул.,
дом №47, кв. 1, ЦЕЛЯКОЎСКАЙ.

**Лётарэя**

У першы дзень розыгрышу Першае бліскавічнае лётарэі БСП у г. Менску выйгралі: Трахімовіч, удава-пэнсіянэрка — 40 райхсмарак, Ніхіеўскі Адвард, работнік аўта-рамонтнага заводу — 40 райхсмарак, Дзеравяга Зьмітра, кладаўшчык БСП — 100 райхсмарак.

Лётарэйная камісія БСП.

**Паведамленьне**
Гарадзкога Камісара Менску
***Аб Падбіваньні Падэшваў да Абутку***
Паводля распараджэньня сп. Гэнэральнага Камісара Беларусі, у часе ад 1 красавіка да 1 кастрычніка 1943 г. забараняецца падбіваньне скураных падэшваў да абутку. Процідзеяньні будуць карацца.
Менск, 29 сакавіка 1943 г. Гарадзкі Камісар Янэцкэ.

## ТРАМВАЙ
Пайшоў

Ад сыботы пайшоў ізноў Менскі трамвай! Тымчасам ходзіць ён на лініі былога №1 ад Камароўскага парку й пакуль да Ліповае вуліцы (б. Валадарскага), паступова асвойваючы й далейшыя дзялянкі ў кірунку да пасажырскага вакзалу. На ўсёй лініі ўстаноўлена 10 упынак.

Дык–жа віншуем із гэтым нашых чытачоў, якія павінны цяпер ужо дараваць неаднаразовыя паведамленьні ў нашай газэце, якія не маглі спраўдзіцца сваім часам.

## Не Загульвайцеся
На Вуліцах!

Дажджыстае надвор'е гэтага лета ўсім абрыдла. Таму, як здарыцца пагодны вечар, дык усе радыя, высыпаюць на вуліцы і гуляюць там, балазе дні цяпер даўгія. Але тут забываюцца, што з прычыны трывожнага часу хадзіць можна толькі да 21–ае гадзіны. Таму ўсім нашым чытачом раім старацца на гэтую гадзіну быць ужо ў хаце.

## Менскія Навіны.
Газавая Камара.

Пачатая будова паказальнае газавае камары ў гор. Менску пры Менскай паветавай вэтэрынарнай лякарні (якая знаходзіцца пры Грушаўскай вуліцы). Пабудова гэтае газавае камары павінна быць закончаная ў верасьні месяцы сёлета. Газавая камара разьлічаная на лячэньне на каросту хворае жывёлы навейшым мэтадам — абкурваньнем сярнічастым газам, якое дае вельмі хуткае і радыкальнае лячэньне. Лячэньне будзе праводзіцца пад кіраўніцтвам загадчыка Менскае паветавае вэтэрынарнае лякарні, добрага спэцыяльнага вэтэрынарнага лекара Ўладзімера Аляксандрава.

*К. Пракаповіч.*

## Паведамленьне
Да ведама Гаспадароў Жывёлы

У дадатак да распараджэньня Гаспадарскага аддзелу Менскага Гарадзкога Камісарыяту ад 15.II.1943 г. аб забароне продажу і забою жывёлы без дазволу Гарадзкога Камісару даводзіцца да ведама ўсіх гаспадароў жывёлы, што ў выпадку, калі жывёла здохла, труп ейны павінен абавязкова быць здадзены на Мылаварны зав. Менскага Гарадзкога Камісарыяту (Завальная вул., 8) і квітанцыя аб здачы пададзеная ў гаспадарскі аддзел Менскага Гарадзкога Камісарыяту (пакой №17) для зьняцьця з ураханку.

Асобы, якія не здадуць трупу здохлае жывёлы, будуць аштрафаваныя.

28.IV.43 г. Гаспадарскі Аддзел Менскага Гарадзкога Камісарыяту.

**Прыблудзілася**
каза. Даведацца: г. Менск, Стара-Віленская 6, кв. 10, Шаев В. В.

**УВАГА!**
Ад 17 да 23 кастрычніка зацямненьне ад 17, 07 да 7, 06.

**Беларускія Паліцыянты, Памятайце:**

Што апрача бальшавікоў ня меншым вашым ворагам зьяўляецца алькаголь,

Што п'янствам вы атручваеце сваё цела і душу і ганьбіце сваё імя паліцыянта перад сваім народам,

Што сумленна могуць выканаць свае ганаровыя абавязкі паліцыянта ў змаганьні з бальшавізмам і ў службе народу толькі цьвярозыя людзі.

Што інтарэсы беларускай нацыі вымагаюць у гэтай вайне быць у саюзе зь немцамі,

Што Вы зьяўляецеся першымі беларускімі жаўнерамі,

Што праз Вашае сумленнае выкананьне абавязкаў паліцыянта, як змаганьне з бандытызмам, вартавай службай і да г. п. народ бярэ ўдзел у гэтай вайне.

Што Вы — косьць ад касьці і кроў ад крыві Беларускага Народу;

Што Вы павінны быць дзеля гэтага ягонымі найлепшымі абаронцамі, дарадчыкамі і апекунамі ў кажнай патрэбе;

Што кажны Ваш добры ці благі ўчынак можа заважыць на лёсах вашага народу і Бацькаўшчыны.

Што вы служыце вашай Бацькаўшчыне — Беларусі,

Што няма на сьвеце рэчы важнейшай, прыгажэйшай і больш ганаровай, як служыць сваёму народу,

Што найвышэйшым выразам гэтае службы, якая акрывае людзей несьмяротнай славай, — аддаць жыцьцё за свой народ і Радзіму.

Што дысцыпліна — гэта сумленнае выкананьне сваіх абавязкаў,

Што моц народу залежыць ад дысцыпліны ягоных грамадзян,

Што незалежнасьць могуць здабыць толькі народы дысцыплінаваныя.

Нацыянальныя абрады — гэта ёсьць праяўленьне душы народу на вонкі.

Чым багацейшая народная абраднасьць, тым вышэйшая духоўная культура народу.

Любіць і шанаваць свае нацыянальныя абрады — гэта любіць і шанаваць свой народ.

**ГУМАР**

— Ваша маршалкаўская вялікасьць, — паведамляе камандзір чырвонае арміі Сталіну, — нашая дывізыя перайшла да немцаў.
— Расстраляць дзьве з тых, што засталіся, — загадаў Сталін.

Спаткаліся аднаго разу два чужаземныя прадстаўнікі і разгаварыліся. Амэрыканскі прадстаўнік кажа: «Ах, які геніяльны наш Рузвэльт, ён адвучыў жыхарства Злучаных Штатаў піць гарэлку».

«Ну што ж тут такога», — зьдзівіўся савецкі прадстаўнік. — «Наш Сталін даўно ўжо адвучыў народ есьці, і гэтым у нас ніхто ня хваліцца».

Далей той жа самы чужаземец пытае: «А што азначае СССР?»

«Тры Срулі і Адзін Рускі», — адказвае савецкі прадстаўнік.

**Узрост Сталіна**

У першай клясе народнае савецкае школы настаўнік, расказваючы аб вонкавым выглядзе Сталіна, пытае дзяцей:

— Хто ведае, якога ўзросту Сталін?

— Я ведаю, — адказвае адзін хлопчык, — сто шэсьцьдзесят тры сантымэтры.

— Адкуль ты гэта ведаеш? — зьдзіўляецца настаўнік.

— Я зьмерыў.

— Як, ты зьмерыў Сталіна?

— Не, тату. Мой тата заўсёды кажа, што Сталін яму вось так. — Пры гэтым хлопчык правёў сабе рукой па горле.

Жаўнер уваходзіць да аднае сялянскае хаты і, пабачыўшы шмат дзяцей, пытае гаспадыню: «Чаму ў цябе, гаспадынька, так шмат дзяцей? Ці ж гэта так прыемна іх узгадоўваць?» Запытаная адказвае: «Узгадоўваць то ня вельмі прыемна, але... але прадукцыя дзяцей мне вельмі падабаецца».

У Слонімскай акрузе адзін зьвяз беларускага батальёну сустрэўся з партызанскім атрадам. Пачалася перастрэлка. У выніку яе партызаны з клічам: «Гура, за Сталіна, за Родзіну», кінуліся ўцякаць.

**Тры Мовы**

Маці — да сына, які служыць у паліцыі: — Як ты размаўляеш з «партызанамі–бандытамі»?

Сын: — На трох мовах: куляй, гранатай, штыхом, залежна ад далечыні!

На вуліцы ў Менску «беднае дзіцянё»: «Спадару, дайце капеечку. Я хачу пайсьці да мамкі».

Спадар, даючы паўмаркі, пытае: «А дзе ж твая мамка?» — «Мамка з суседам пайшла ў кіно».

***Ад Рэдакцыі***

У №4 нашага часапісу ў «Песьні жаўнера» Міхася Кавыля закралася памылка. У другой страфе з гары ў другім вершы замест: — у жаўнера ў сэрцы шэра... належыць чытаць: — у жаўнера ў сэрцы вера...

**Загад**

Усім настаўнікам усіх школ Беларусі

Беларуская Нацыянальная Самапомач хоча арганізаваць дапамогу дзецям-школьнікам так, каб яны ў 10 гадзін даставалі сьнеданьне, якое будзе складацца з кавалка хлеба — 100 грамаў, памазанага павідлам, ці патакай, ці чым іншым, што будзе пад рукой.

Таму загадываю ўсім настаўнікам памагаць у гэтай акцыі органам БНС, а калі б такога воргану, гуртка ў вёсцы, дзе ёсьць школа, дагэтуль не было, дык запрапанаваць свае сілы да помачы цэнтрам БНС праз раённыя ці акруговыя аддзелы БНС і ўзяць на сябе арганізацыю гуртка БНС.

Справа гэтая вельмі паважаная, і таму загадваю аднесьціся да яе з максымальнай энэргіяй і ахвотай.

За Гэнэральнага Камісара Беларусі<br>з даручэньнем<br>Др. ВЭБЭР.

Кіраўнік Інспэктарыяту Беларускіх Школ<br>пры Гэнэральным Камісары Беларусі<br>СІВІТЦА.

*Падрыхтаваў Анатоль Прасаловіч паводле «Беларускай газэты», часопісаў «Беларус на варце», «Беларуская школа» і «Жыве Беларусь» за 1941—1944 гады пры ўдзеле Юрася Бушлякова.*